Заўтра, 3 сакавіка,— дзень выбараў у Вярхоўны Савет БССР і ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных Беларускай ССР. Аддадзім свае галасы за лепшых прадстаўнікоў народа!

УСЕ—НА ВЫБАРЫ!

Незвычайна рана праснецца заўтра наш родны Мінск, уся рэспубліка. Яшчэ сонца не разгоніць начную цемру, а па замеценых снегам вуліцах да выбарчых участкаў святочна настроенныя, радасныя і шчаслівыя будуць ісці першыя выбаршчыкі. Роўна ў шэсць гадзін раніцы пачнецца ўсенароднае свята, роўна ў шэсць гадзін раніцы пачнецца галасаванне. Кожны прыдзе раней, каб першым аддаць свой голас за лепшых прадстаўнікоў народа, яго лепшых дачок і сыноў. І сярод першых абавязкова будзе нехта самы першы, які атрымае выбарчыя бюлетэні, які самым першым апусціць іх у выбарчую урну. Хай гэта будзе рабочы ці студэнт, вучоны ці служачы, калгаснік ці воін, хай гэта будзе сівы стары ці бязвусы юнак, маладая маці ці заслужаная пенсіянерка, хай гэта будзе прадстаўнік любой нацыянальнасці, — гэта будзе наш, родны, магутны савецкі чалавек, якому пад сілу любыя планы, любыя задумы, любыя велічныя задачы.

Дзень выбараў у Вярхоўны Савет Беларускай ССР і ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных рэспублікі стане сапраўдным святам для кожнага выбаршчыка. А якое свята праходзіць без песен і весялосці?! Нашы студэнты — удзельнікі мастацкай самадзейнасці падрыхтавалі для выбаршчыкаў некалькі разнастайных канцэртных праграм.

На выбарчых бюлетэнях можна прачытаць імёны лепшых прадстаўнікоў народа. Па Ленінскай выбарчай акрузе кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР вылучаны кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ таварыш К. Т. Мазураў, па Дабралюбаўскай выбарчай акрузе горада Мінска — рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, акадэмік, прафесар А. Н. Сеўчанка, кандыдатам у дэпутаты гарадскога Савета дэпутатаў працоўных з'яўляецца прарэктар БДУ імя У. І. Леніна дацэнт А. Я. Малышаў, кандыдатам у дэпутаты Ленінскага раённага Савета дэпутатаў працоўных горада Мінска — прафесар, доктар навук М. А. Жыдовіч.

Прыняць самы актыўны ўдзел у выбарах — грамадзянскі абавязак кожнага савецкага чалавека.

Як павіншаваць сяброваў?

У нас ва універсітэце вучацца дзяўчаты розных нацыянальнасцей: беларускі, рускія, кубінкі, в'етнамкі і іншыя. Хутка надыйдзе Міжнародны дзень 8-га сакавіка. Вам хочацца павіншаваць сваіх сябровак са святам, а вы не ведаеце, як гэта зрабіць. Вазьміце гэты нумар нашай газеты і запомніце, як гучаць словы «Віншую Вас з Міжнародным жаночым днём!» на розных мовах:

На рускай: «Поздравляю Вас с Международным женским днем!».

На іспанскай: «Феліцыто а устэдэс эн эл дыа інтэрнасьонал дэ лас мугерэс!».

На в'етнамскай: «Сін цюк мын как бан нян нгай фу ны куок тэ!».

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 7 (516) Субота, 2 сакавіка 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

Сямігодка, дзень 1513-ы

«21 лютага 1963 года, 1513 дзень сямігодкі. Звычайны, будзённы. Ён нічым не адрозніваецца ад іншых, што былі да яго. Скажам прама: бывалі дні і паярчэй, азнаменаваныя беспрыкладнымі скачкамі чалавека ў космас або партыйнымі з'ездамі, прымаючымі дакументы гістарычнай важнасці.

Але і ў ім, у гэтым дне, як у кроплі расы, адлюстравалася велічнасць нашага часу, пафас стварэння і творчасці ў імя камунізма».

Гэтымі словамі адкрываецца чарговы нумар вучэбнай газеты аддзялення журналістыкі «Журналіст», якая расказвае аб адным звычайным дне сямігодкі на Мінскім аўтамабільным заводзе.

Нумар падрыхтаваны студэнтамі 2 курса пад кіраўніцтвам дацэнта Марка Саламонавіча Зярніцкага. Намеснік рэдактара па нумару — студэнт А. Адамовіч, адказны сакратар — студэнт М. Аўсіевіч.

Сярод матэрыялаў нумара — расказы аб кандыдатах у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных Лідзіі Рамановай і Зоі Гузавай, пасланцах ад калектыву аўтазавода.

Заўсёды ў пошуках

Пачатак навуковай дзейнасці ў Марыі Андрэеўны Жыдовіч быў нешчаслівы. Маладая аспірантка толькі-толькі закончыла работу над дысертацыяй, як грымнула вайна. Налёты фашысцкіх самалётаў, выбухі бомбаў. Эвакуацыя. Дысертацыя загінула. Не вярнуўся з вайны муж. Як пайшоў на апошні дзяржаўны экзамен, так і не сустрэліся болей.

Вялікае гора не зламіла волі мужнай жанчыны. У далёкім Свярдлоўску яна аднавіла сваю дысертацыю і паспяхова абараніла яе. У родны Мінск вярнулася кандыдатам мовазнаўчых навук і пачала сваю навуковую дзейнасць у Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Многа цяжкасцей прыйшлося пераадолець, нялёгка было працаваць: не хапала аўдыторый, жылля. Але вяртанне на родную зямлю надавала многа сіл вучоным універсітэта. І, здавалася б, невыносныя цяжкасці паступова пераадольваліся.

Марыя Андрэеўна разгарнула велізарную навукова-даследчую работу. Збіранне і вывучэнне беларускіх гаворак, складанне слоўнікаў, работа з маладымі аспірантамі займае ў яе многа часу. У часопісах часта друкуюцца яе навуковыя працы па гісторыі фанетыкі і марфалогіі беларускай мовы. Неўзабаве яна абараняе доктарскую дысертацыю і становіцца адзіным у БССР доктарам мовазнаўчых навук. Тым часам рос і развіваўся універсітэт. Цяпер ён не цясніцца болей у трох невялікіх карпусах. Велічэзны гмах на Ленінскім праспекце — адзін з самых вялікіх і прыгожых будынкаў у сталіцы. У светлых аўдыторыях і прасторных даследчых лабараторыях навучаюцца больш васьмі тысяч студэнтаў з адрывам і без адрыву ад вытворчасці.

Заўсёды ў пошуках, заўсёды ў клопатах бачаць студэнты і аспіранты свайго любімага прафесара. У часы зімовых і летніх канікулаў у акружэнні студэнтаў і маладых навуковых супрацоўнікаў яна накіроўваецца ў экспедыцыі па вывучэнню народных крыніц роднай мовы. Няма такога кутка на Беларусі, дзе б не пабывала Марыя Андрэеўна. Вось і зараз яна кіруе вялікай работай па складанню слоўніка твораў Янкі Купалы. Задача нялёгкая. І Марыя Андрэеўна разам з мовазнаўцамі універсітэта ўжо не адзін раз ездзіла на радзіму паэта, знаёмілася з моваю тых мясцін, дзе рос і гадаваўся паэт, адкуль ён чэрпаў багацце роднай мовы.

Марыя Андрэеўна Жыдовіч падрыхтавала вялікую колькасць навуковых работнікаў. Пад яе кіраўніцтвам абаранілі дысертацыі і сталі вучонымі дзесяць аспірантаў. Многія яе выхаванцы маюць навуковыя працы. Як цэняць яны таварыскую падтрымку і шчырую дапамогу свайго прафесара!

Сваю навукова-даследчую работу Марыя Андрэеўна спалучае з вялікай грамадскай работай. Яна ўваходзіць у састаў партыйнага бюро філалагічнага факультэта, кіруе дыялекталагічнымі гуркамі студэнтаў.

Любяць і паважаюць свайго прафесара студэнты і аспіранты. Вось чаму яны аднадушна назвалі Марыю Андрэеўну Жыдовіч сваім кандыдатам у дэпутаты Ленінскага раённага Савета дэпутатаў працоўных. Яна заўсёды будзе верна служыць інтарэсам народа.

У. КУЛАЖАНКА.

УШАНОЎВАННЕ ЮБІЛЯРА

22 лютага прафесарска-выкладчыцкі калектыў, аспіранты і студэнты універсітэта, грамадскасць беларускай сталіцы шырока адзначылі 60-годдзе з дня нараджэння і 30-годдзе навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці акадэміка Акадэміі навук БССР, рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта, прафесара Антона Нікіфаравіча Сеўчанкі. Юбілею вучонага было прысвечана спецыяльнае пасяджэнне вучонага Савета універсітэта і Прэзідыума Акадэміі навук БССР.

У пачатку пасяджэння з прывітаннем ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Цэнтральнага Камітэта КПБ і Савета Міністраў Беларускай ССР выступіў Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Васіль Іванавіч Казлоў. Ён горача павіншаваў юбіляра з 60-годдзем з дня нараджэння і 30-годдзем навукова-педагагічнай і грамадскай дзейнасці, пажадаў яму здароўя і плённых поспехаў у навуковай дзейнасці. Таварыш Казлоў пад бурныя апладысменты сабраўшыхся ўручыў Антону Нікіфаравічу Сеўчанку высокую ўрадавую ўзнагароду — Ганаровую Грамату Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Затым з цёплай прамовай аб юбіляру выступіў акадэмік-сакратар аддзялення фізіка-матэматычных, хімічных і геалагічных навук, акадэмік АН БССР Н. Ф. Ярмоленка. Прамоўца расказаў аб тым, як звычайны вясковы юнак, дзякуючы перамозе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, дзякуючы савецкай уладзе, змог выбрацца з цемры, атрымаць адукацыю і стаць славутым вучоным. Як вучань і прадаўжальнік справы вялікага вучонага-фізіка Сяргея Іванавіча Вавілава, Антон Нікіфаравіч Сеўчанка зрабіў многа адкрыццяў, напісаў шмат арыгінальных навуковых работ. Асабліва ярка расквітнеў талент вучонага пасля таго, як праз 20 гадоў растання Антон Нікіфаравіч зноў вярнуўся на родную зямлю. Акрамя навуковай работы, ён разгортвае вялікую арганізатарскую і грамадскую дзейнасць. Нездарма працоўныя рэспублікі вылучылі прафесара сваім пасланцам у Вярхоўны Савет рэспублікі.

Прывітаць юбіляра прыбылі міністры і намеснікі міністраў амаль усіх міністэрстваў рэспублікі, прадстаўнікі вышэйшых навучальных устаноў і навуковых цэнтраў Масквы, Ленінграда, Кіева, Львова. Адзін за адным яны ўзнімаюцца на трыбуну, каб цёпла павіншаваць юбіляра. На стале расце стос юбілейных прывітальных адрасоў, памятных падарункаў. Студэнты, выкладчыкі ўручаюць Антону Нікіфаравічу букеты жывых кветак, чытаюць цёплыя шчырыя вершы.

Тэлеграмам і віншаванням няма канца. Але вось старшынствуючы прарэктар універсітэта Андрэй Якаўлевіч Малышаў прадстаўляе слова юбіляру. У зале ўспыхваюць апладысменты. Расчулены і ўдзячны за шчырую ўвагу да яго, за высокую ацэнку яго навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці, за пажаданні моцнага здароўя і доўгіх год жыцця, Антон Нікіфаравіч Сеўчанка запэўніў вучоных, студэнтаў, усіх прысутных, што ён і далей, пакуль б'ецца сэрца, будзе верна служыць справе развіцця навукі, справе будаўніцтва камунізма ў нашай краіне.

„Эстэтыка ў быце"

На такую тэму адбыўся вечар на агітпункце выбарчага ўчастка № 18 Ленінскага раёна.

На вечары з дакладам «Жыць па законах прыгажосці» выступіла прафесар Л. І. Фіглоўская. Яна гаварыла аб значэнні прыгожага ў жыцці савецкага чалавека. З цікавасцю слухалі маладыя выбаршчыкі выступленне намесніка старшыні Саюза мастакоў Беларускай ССР І. Нікіфарава. Сваё выступленне мастак прысвяціў ролі савецкага мастацтва ў справе будаўніцтва камунізма. Разам з тым І. Нікіфараў рэзка крытыкаваў абстракцыянізм, як чужы і варожы нашаму народу напрамак у мастацтве. Вечар закончыўся выступленнем кампазітара Ю. Семянякі, які расказаў аб сваёй творчасці і выканаў некалькі вакальных нумароў.

Тэматычны вечар вельмі спадабаўся выбаршчыкам.

В. КУПРЫЕНКА,
аспірант.

Агляд друку

„Добра", але ёсць адзнака „выдатна"!

Перад намі чацвёрты нумар насценнай газеты «Пражэктар» — органа студэнцкага савета інтэрната № 1. Паглядзім, якія пытанні ўзнімае ён. Нумар выпушчаны пад рубрыкай «Інтэрнат — твой родны дом. Утрымлівай яго ў чысціні і парадку».

Член камітэта камсамола універсітэта М. Якімчык у аглядзе ўнутранага парадку ў пакоях інтэрната прыводзіць у якасці ўзору пакой № 86. «Усё тут радуе вока,—піша аўтар,— акуратна запраўленыя ложкі, роўныя стосы кніг, чыста вымытая падлога». Сярод лепшых М. Якімчык называе пакоі №№ 88, 28, 36, 73, 90, 132 і іншыя. Ён крытыкуе членаў 56-га пакою, дзе старастай Яфімаў, за непарадак.

З заметкай «У нас заўсёды парадак» выступае Марыя Кардзюкова. Пад іншымі заметкамі — подпісы студэнта Я. Казюкіна, члена прафкома універсітэта Трафімука і іншых.

Радуе, што ў кожным нумары газеты выступаюць некалькі аўтараў. Гэта вызначае работу рэдакцыйнай калегіі з добрага боку. Гэта робіць газету цікавей.

У газете публікуюцца фотаздымкі члена рэдкалегіі студэнта аддзялення журналістыкі У. Бабраўнічага. На плёнку фіксуюцца парушальнікі ўнутранага парадку, парушальнікі дысцыпліны.

Газета выходзіць адзін раз у месяц. Спецыяльныя нумары прысвячаюцца вялікім падзеям, датам у нашым жыцці. Да дня святкавання гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі рэдкалегія выпусціла змястоўны нумар. Спецыяльны нумар рыхтуецца таксама да святкавання Міжнароднага жаночага дня 8 сакавіка.

Амаль у кожным нумары газеты змяшчаецца куток сатыры, дзе крытыкуюцца нядбайныя студэнты, жыхары інтэрната.

Трэба адзначыць буйны недахоп у рабоце рэдкалегіі — яна не дамагаецца рэагавання на крытычныя матэрыялы. Рэдактар газеты Галоўчанка некалькі разоў напамінаў аб неабходнасці рэагавання членам студсавета, але і вухам ніхто не правёў. Не звяртае ўвагі на крытычныя выступленні насценнай газеты і старшыня студсавета Л. Рэут. Гэта не знімае з рэдкалегіі адказнасці за дзейснасць матэрыялаў. Яна павінна больш рашуча весці сваю правільную, у цэлым, лінію.

«Добра»! Так можна ацаніць работу рэдакцыйнай калегіі «Пражэктара». Аднак гэта не павінна спыняць яе на дасягнутым. Ёсць жа яшчэ адзнака «выдатна»!

К. КАНУС.

З замежнага гумару

ПАСЛЯ ЭКЗАМЕНА

Вучань тэлеграфіруе маці:

«Праваліў экзамен, падрыхтуй бацьку».

На другі дзень атрымаў адказ:

«Бацька падрыхтаваны. Цяпер ты падрыхтуйся».

* * *

Сусед выцягнуў з рэчкі зубнога ўрача, які пачаў тануць.

— Дарагі чалавеча, — кажа той, — як жа табе аддзякаваць за тваю дабрату? Прыходзь да мяне, я табе ўсе зубы без чаргі павырываю.

А чаму без жывінкі?

Тое, што семінарскія заняткі прыносяць велізарнейшую карысць, відавочна, не стане адмаўляць ні адзін студэнт. А чаму, ды як — гэта таксама аксіёма. Таму мне хочацца пагаварыць аб другім, выказаць некаторыя свае думкі, дакладней, не свае, а многіх маіх аднакашнікаў.

Аднойчы я спытаў у свайго сябра:

— Слухай, як табе падабаюцца практычныя заняткі?

— Ат, так сабе, — адказаў той. — Штосьці не адчуваецца жывінкі.

«Не адчуваецца жывінкі». Гэта верна. І мы тут жа рашылі выявіць: а чаму?

Можна згадзіцца з тым, што хто-ніхто са студэнтаў на практычных занятках дзейнічае па прынцыпе «мая хата з краю», іншыя, прытрымліваючыся напісанага ў падручніках, баяцца выказаць сваю ўласную думку (а што, калі не так!). Але чаму ж тады ў інтэрнаце разгараюцца гарачыя дэбаты, да хрыпаты, да паўночы? І не толькі аб паэзіі Еўтушэнкі, аб «Зорным білету», але па тых пытаннях, якія «разбіраліся» на семінарскіх занятках.

Прычына, відавочна, вось у чым. Часта на практычных занятках выкладчыкі баяцца размоў на «пабочныя» тэмы. Адхіліўся студэнт ледзь-ледзь ад пытання, як тут жа чуе «ц-у» (цэлевую ўстаноўку).

— Аб гэтым мы пагаворым калі-небудзь у іншы раз. А сёння ў нас тэма...

А гэта звязвае студэнтаў, і семінары без дыскусій праходзяць неяк вяла, а часам і не пакідаюць нават следу ў памяці.

І яшчэ. Звычайна перад сесіяй пачынаецца штурмаўшчына: семінар на семінары едзе і семінарам паганяе. У першым семестры ў нас здаралася, што ў адзін дзень праводзіліся практычныя заняткі адразу па трох прадметах. У такіх выпадках добра падрыхтавацца да семінараў вельмі цяжка.

А цяпер вось «прахлада», ціш ды гладзь...

Ці нельга зрабіць так, каб практычныя заняткі вяліся паралельна лекцыям, як гэта робіцца па курсах гісторыі КПСС і сучаснай рускай мовы, на працягу ўсяго навучальнага года?

Іван РУПЕКА,
студэнт 1 курса аддз. рускай мовы і літаратуры.

Ці ведаеце вы, што...

...Самы высокі чалавек у свеце — гэта жыхар Лівіі Сулейман Нашнум? Яго рост 250 сантыметраў. Зараз Сулейману 17 гадоў, і ён працягвае расці амаль па адnаму сантыметру кожны месяц. Калі яму было 8 гадоў, то за адну ноч ён вырастаў на 3—4 сантыметры.

Польска-беларускі слоўнік

У Польшчы выйшаў з друку польска-беларускі слоўнік. У ім 1084 старонкі. Слоўнік апрацаваны пад рэдакцыяй прафесара А. Абрэмбскай-Яблонскай — кіраўніка кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта і кандыдата навук М. Бірылы — супрацоўніка Акадэміі навук Беларускай ССР, які некалькі гадоў працаваў на кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта.

Да ведама чытачоў

У рэдакцыі нашай шматтыражнай газеты пачынае работу новы аддзел — замежны. У яго ўваходзяць студэнты падрыхтоўчага факультэта Мануэль дэ ла Гуардыя і Уільсан Сота. Аддзел перыядычна будзе падрыхтоўваць для нашай газеты матэрыялы аб жыцці і вучобе замежных студэнтаў, якія навучаюцца ў нас ва універсітэце, аб іх быце і адпачынку, аб жыцці ў іх родных краінах.

Наш конкурс працягваецца

У мінулым нумары мы звярнуліся да вас, чытачы, з просьбай даць лепшую назву фотаздымку, які зрабіў студэнт-завочнік А. Войда. Некалькі чалавек ужо далі свае назвы. Якія? Калі ласка.

Казімір Канус (1 курс аддз. журналістыкі) — «Ціцыня».

Уладзімір Мангіновіч (1 курс аддз. журналістыкі) — «Зімовая казка лесу».

Вадзім Іванавіч Дубовік (выкладчык) — «Зімовы пейзаж».

Анатоль Ганчароў -Мірачыцкі — «Іней».

Эрнст Лейкін (3 курс гістфака) — «Зімовы дзень».

Георгій Рылюк (сакратар камітэта камсамола) — «Зімовая казка»

Іван Шорац (3 курс гістфака) і Ольга Лампе (3 курс геафака)— «Зімовы лес».

Аляксандр Фларызяк (1 курс аддз. журналістыкі) — «Цуды зімы».

Іван Капыловіч (1 курс аддз. журналістыкі) — «Зіма—паэтэса».

Мы звяртаемся да вас, дарагія чытачы, прымайце ўдзел у нашым конкурсе на лепшую назву. Апошні тэрмін падачы прапаноў— 15 сакавіка.

Так быў пастаўлены „Архімед"

У канцы лістапада на дошцы аб'яў фізічнага факультэта з'явіўся спіс прозвішчаў (сама па сабе з'ява частая), а ніжэй — прыпіска: сабрацца ў камітэце камсамола ў дзевяць гадзін. Для чаго — пакуль яшчэ ніхто не ведаў. Але мне пашанцавала — па сакрэце мне расказалі, што будзе чытацца сцэнарый оперы «Архімед», які прывезлі з Масквы.

Пайшла з цікавасці. Амаль усе сабраўшыяся былі незнаёмыя.

Мяне сцэнарый уразіў. Гэта ж цуда, знаходка, тое, чаго нам так доўга не хапала!

Думка аб тым, што паставіць «Архімеда» будзе цяжка, нават вельмі-вельмі цяжка, прыйшла потым. Спачатку была толькі радасць — з'явілася такая цікавая справа.

Першае пытанне — кадры. Уласна кажучы, яно стаяла ўвесь час, ад пачатку да канца работы над спектаклем. Галоўная замінка выйшла ў самым пачатку — у оперы толькі адна жаночая роля — роля Венеры. Хваляванне сярод дзяўчат. У оперы ж галоўнае — голас. Намецілі выканаўцаў арыентыровачна. Усе — студэнты з першага і другога курсаў. Аркестр замяніла піяніна (хоць на першых часах пагаворвалі аб стварэнні спецыяльнага аркестра), а нязменны канцэртмайстар— Лада Барташэвіч. Вось ужо каму дасталося за гэты час!

Лёня Понтус і я, на правах старшакурснікаў і ў некаторым родзе ветэранаў, узяліся ставіць оперу. Зразумела, на першай жа рэпетыцыі кандыдатам у салісты прапанавалі спяваць. Галоўны вынік гэтага — знайшоўся Архімед. Ён прыйшоў і адразу заспяваў. Спачатку Апалона, потым— Марса, потым — Архімеда. Па-першае, адчувалася, што ён любіць спяваць, па-другое, у яго выдатныя знешнія данныя. Рашылі парушыць традыцыйныя ўяўленні аб вучоным. Няхай наш Архімед будзе і фізічна пераўзыходзіць багоў. Не дарэмна ж фізфак займае першае месца ва універсітэцкай спартакіядзе. Так быў знойдзен выканаўца на ролю Архімеда — першакурснік П. Тарасевіч.

Венера (Рая Маісеева з 2 курса) таксама адшукалася адразу— з прыемным чыстым голасам і на рэдкасць добрым характарам. Яна была адзіная, не прапусціўшая ніводнай рэпетыцыі, не лічачы, зразумела, Лады.

На ролю Марса быў знойдзен студэнт з добрым голасам, але вельмі ненадзейны — другакурснік А. Новікаў. Ён і падвёў нас у канцы.

Доўга не маглі знайсці выканаўцу на ролю Апалона. Можа таму, што на пятым паверсе ў гісторыкаў ёсць скульптура Апалона Бельведэрскага. Кожны прэтэндэнт на гэтую ролю, у думках параўноўваючы сябе з ім, знаходзіў, што параўнанне яўна не ў карысць прэтэндэнта, і адмаўляўся ад удзелу ў спектаклі. На адной з рэпетыцый крызіс быў нават такі, што прапанавалі зрабіць Апалонам таго, хто больш за ўсіх спазняецца на рэпетыцыі. Апалон прыйшоў нечакана. Гэта У. Міхайлоўскі з першага курса. Затое мы былі ўзнагароджаны за доўгія пакуты пошукаў. Гэта сапраўдны Апалон у сучаснай інтэрпрэтацыі.

У оперы ёсць таксама сольная партыя Бахуса. Бахуса знайшлі нават не на першай рэпетыцыі, а яшчэ на чытцы оперы — першакурснік М. Сабатковскі, юнак, які мае неаспрэчную перавагу. Узяўшы яго на ролю Бахуса, не прыдзецца траціцца на грым. Ён згадзіўся і стаў адным з акуратных удзельнікаў, нават завёў улік спазненням, за якія налічвалі штраф. Спяваў Бахус дрэнна, дасканалей, не спяваў увогуле, бо ўвесь час быў хворы, але ён вельмі ўжо натуральна хістаўся.

Вопыту ў пастаноўцы опер, натуральна, у нас не было. Таму на кожным кроку мы сустракалі неверагодныя цяжкасці. Прыкладна да 25 снежня «Архімед» спяваўся больш-менш без прыпыненняў, у меру фальшыва. Нават па гадзіннику можна было прасачыць, колькі часу опера займае. Ад некаторых салістаў прыходзілася патрабаваць неверагоднага: дыяпазон Архімеда — Сусанін і Ленскі, Марса — варажскі госць і Дон-Жуан. А тут яшчэ надыйшла экзаменацыйная сесія ў малодшакурснікаў. Каб паставіць оперу да Новага года, трэба было б на тыдзень адарваць усіх ад заняткаў. На гэта, зразумела, нельга было пайсці. Рашылі «Архімеда» на некаторы час кансерваваць. Толькі 7 лютага ўзнавілі рэпетыцыі. А на 16-е была запланавана прэм'ера (зноў-такі з-за сесіі, на гэты раз у чацвёртакурснікаў). За нейкі тыдзень трэба было паставіць «Архімеда» на ногі. На першы збор прыйшлі толькі пяць харыстаў і нават не ўсе салісты. Некаторыя ўдзельнікі правалілі сесію. Марс таксама падвёў.

Цяпер я здзіўляюся, як гэта ні на мінуту ў мяне не было сумнення ў тым, што «Архімед» будзе пастаўлены. У нас жа не было амаль нічога, акрамя энтузіязма. У хор прыйшлі студэнты 4 курса, рызыкуючы залікам і курсавымі. Знайшлі выканаўцу на ролю Марса (Л. Фрыдман з 5 курса). Запрацавала бюракратычная машына — падпісваліся розныя паперкі, даставаліся касцюмы, парыкі, маляваліся дэкарацыі (галоўны афармляльнік Л. Рудова).

На спектакль было страшна ісці. І, нарэшце, паднялася заслона. Што было — убачылі гледачы. Зразумела, было горш, чым можна было зрабіць. Але нават тое, што дзеянне ідзе, час ад часу перапыняючыся апладысментамі, здавалася цудам. Нарадзіўся «Архімед»!

Л. ТУРБІНА,
студэнтка 4 курса фізфака, рэжысёр-пастаноўшчык спектакля.

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсавпрофа.
АТ 09783. Тыр. 2000 Зак. 799.